Апытальнік на падставе прац камісій I Сінода Гродзенскай дыяцэзіі (4)

Аўтар: Рэдакцыя
09.02.2020 00:00



Жыць Евангеллем.

Першы Сінод Гродзенскай дыяцэзіі Камісія па справах новай евангелізацыі (рухаў і таварыстваў)

1. Якія Вы ведаеце таварыствы і рэлігійныя рухі?
2. Якія рэлігійныя рухі і таварыствы існуюць і дзейнічаюць у Вашай парафіі?
3. Што Вы разумееце пад выразам “новая евангелізацыя”?
4. Як думаеце, ці існуе сёння патрэба новай евангелізацыі, і як можна яе рэалізаваць у парафіі, дэканаце, дыяцэзіі?
5. Ці лічыце якасным развіццё рэлігійных рухаў у Вашай парафіі, дэканаце, дыяцэзіі?
6. Ці ўдзяляецца адпаведная ўвага развіццю рэлігійных рухаў і таварыстваў у Вашай парафіі, дэканаце, дыяцэзіі?
7. Ці лічыце дастатковым клопат духоўных і кансэкраваных асоб аб дзейнасці рэлігійных рухаў?
8. Хто, на Вашу думку, павінен пераважна кіраваць рэлігійнымі рухамі – духоўныя ці свецкія асобы? Чаму?
9. На якім узроўні ў рэлігійных рухах павінна адбывацца супрацоўніцтва паміж духоўнымі і свецкімі асобамі?
10. Якія напрамкі развіцця рэлігійных рухаў лічыце найбольш патрэбнымі ў Вашай парафіі, дэканаце, дыяцэзіі?
11. Якія маеце прапановы адносна ажыўлення дзейнасці рэлігійных рухаў і таварыстваў у Вашай парафіі, дэканаце, дыяцэзіі?

Камісія па справах місій

1. Што Вы разумееце пад выразам “каталіцкія місіі”?
2. Ці ўдзяляецца адпаведная ўвага тлумачэнню сутнасці каталіцкіх місій у Вашай парафіі, дэканаце, дыяцэзіі? Ці лічыце асвету ў гэтым плане дастатковай?
3. Ці з’яўляецца, на Вашу думку, лакальны Касцёл адкрытым на місійныя патрэбы Паўсюднага Касцёла?
4. Якія намаганні і ініцыятывы ладзяцца ў Вашай парафіі, дэканаце і дыяцэзіі для справы развіцця каталіцкіх місій?

Аўтар: Рэдакцыя
09.02.2020 00:00

5. Якія маеце прапановы адносна ажыўлення місійнай дзейнасці ў Вашай парафіі, дэканаце, дыяцэзіі?

Камісія па справах
сродкаў масавай інфармацыі

1. Якія дыяцэзіяльныя каталіцкія СМІ Вы ведаеце і як часта імі карыстаецеся?
2. Якія агульнабеларускія СМІ Вы ведаеце і як часта імі карыстаецеся?
3. Якія іншыя каталіцкія СМІ Вы ведаеце і як часта імі карыстаецеся?
4. Як ацэньваеце прысутнасць дыяцэзіяльнага Касцёла ў медыйнай прасторы – тэлебачанні, радыё, прэсе і інтэрнэце?
5. Што, на Вашу думку, можна зрабіць, каб абудзіць большую зацікаўленасць каталіцкімі СМІ сярод дзяцей, моладзі, дарослых?
6. На Ваш погляд, якія выклікі сёння стаяць перад каталіцкімі СМІ ў дыяцэзіі?
7. Як ацэньваеце падрыхтаванасць духоўных, кансэкраваных і свецкіх асоб, каб развіваць каталіцкія СМІ ў нашай дыяцэзіі?
8. Які, на Вашу думку, уплыў на жыццё лакальнага Касцёла сёння мае дзейнасць католікаў у свецкіх СМІ?
9. Як раіце найлепш выкарыстоўваць сацыяльныя сеткі для пашырэння аўтарытэту Касцёла сярод дзяцей і маладога пакалення?
10. Што можаце прапанаваць для ажыўлення дзейнасці мясцовага Касцёла ў СМІ?

Прыняць удзел у сінадальнай працы можа кожны жадаючы. Запоўнены апытальнік неабходна даслаць у сакратарыят Сінода на паштовы адрас: 230025, г. Гродна, вул. К. Маркса, 4, Курыя, – або на электронную скрыню: synodus.grodnensis@gmail.com.